Крыніца: adu.by Нацыянальны інстытут развіцця адукацыі

**Дэма-версія практычнага задання для экзамена па гісторыі Беларусі, для навучэнцаў 9-х класаў (2022/2023 навучальны год). Білет 13. Варыянт 5. Ч.1**

## Білет 13. Практычнае заданне. Партызанскі рух і падпольная барацьба на акупіраванай тэрыторыі Беларусі ў гады Вялікай Айчыннай вайны.

**Заданні склала:**Афанасьева Ж.Г., гімназія № 7 г. Мінска

**Выкарыстоўваючы прадстаўленыя матэрыялы, адкажыце на пытанні:**

1. Якую назву атрымала скаардынаваная аперацыя савецкіх партызан і падпольшчыкаў па масавым разбурэнні чыгуначных камунікацый у тыле ворага?
2. Якія асноўныя формы барацьбы беларускага народа супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў вы можаце назваць?
3. Дакажыце, што адной з прычын гераічнасці беларускага народа ў Вялікай Айчыннай вайне былі патрыятычныя пачуцці савецкіх людзей.
4. Уявіце сябе ў ролі сучаснага даследчыка, які вывучае гісторыю Вялікай Айчыннай вайны. Як вы думаеце, з якімі цяжкасцямі прыйшлося б вам сутыкнуцца пры вывучэнні дзейнасці партызан і падпольшчыкаў?

**Крыніца 1.**Карта.




**Крыніца 2.**

Тэкст прысягі беларускага партызана, 1942 год.

Крыніца: adu.by Нацыянальны інстытут развіцця адукацыі

Я, грамадзянін Саюза Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік, верны сын гераічнага беларускага народа, прысягаю, што не пашкадую ні сіл, ні самой жыцця для справы вызвалення майго народа ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў і катаў будзе ачышчана пекла нямецка-фашысцкай пагані.

Я клянуся строга і няўхільна выконваць загады сваіх камандзіраў і начальнікаў, строга захоўваць воінскую дысцыпліну і берагчы ваенную таямніцу.

Я клянуся за спаленыя гарады і вёскі, за кроў і смерць нашых жонак і дзяцей, бацькоў і мацярэй, за гвалты і здзекі над маім народам жорстка помсціць ворагу і бесперапынку знішчаць нямецкіх акупантаў.

Я клянуся ўсімі шляхамі і сродкамі актыўна дапамагаць Чырвонай Арміі паўсюдна знішчаць фашысцкіх катаў і тым самым садзейнічаць найхутчэйшаму і канчатковаму разгрому крывавага фашызму.

Я клянуся, што хутчэй загіну ў жорсткім баі з врагам, чым аддам сябе, сваю сям'ю і беларускі народ у рабства крываваму фашызму.

Словы маёй свяшчэннай клятвы, сказанай перад маімі таварышамі-партызанамі, я замацоўваю ўласнаручным падпісам — і пекла гэтай клятвы не адступлю ніколі.

Калі ж па сваёй слабасці, трусасці ці па злой волі я парушу сваю прысягу і здраджу інтарэсам народа, няхай памру я ганебнай смерцю ад рук сваіх таварышаў.

**Крыніца 3.**Фотадакументы.



*Мемарыяльны знак на месцы гібелі У. Амельнюка*



# ЗВЯЗДА

Орган Мінскага Гаркома КП(б)Б

№ 1 ЧЭРВЕНЬ 1942 г.

ТАВАРЫШЫ!

РЭДАКЦЫЯ

1942 ГОД ПАВІНЕН БЫЦЬ ГОДАМ ПОЎНАГА РАЗГРОМА ВОРАГА! СМЕРЦЬ НЯМЕЦКІМ АКУПАНТАМ!

БЛІЗІЦЦА ЧАС АСЛАБАНЕННЯ

*Першы нумар газеты «Звязда», выдадзены ў падполлі*

Крыніца: adu.by Нацыянальны інстытут развіцця адукацыі

**Адказы:**

1. «Рэйкавая вайна».
2. Барацьба беларускага народа супраць нямецка-фашысцкіх акупантаў ажыццяўлялася ў дзвюх асноўных формах: а) узброеныя дзеянні партызан; б) дзейнасць падпольных груп і арганізацый. Да іх можна таксама аднесці масавы зрыў насельніцтвам, якое не ўваходзіла ў склад партызанскіх фарміраванняў і падпольных арганізацый, эканамічных, палітычных і ваенных планаў акупантаў.
3. Адной з прычын гераічнасці беларускага народа ў Вялікай Айчыннай вайне былі патрыятычныя пачуцці савецкіх людзей. У гады Вялікай Айчыннай вайны патрыятызм стаў найважнейшай каштоўнасцю ў савецкім грамадстве. Беларускаму народу заўсёды былі ўласцівы святое пачуццё абароны свайго ачага, роднай зямлі, Айчыны. Таму войны, якія атрымлівалі назву «Айчынных» мелі пад сабой найглыбокі сэнс - яднанні ўсяго народа. Вайна насіла характар справядлівы, вызваленчы.
4. Сучасныя даследчыкі пры вывучэнні дзейнасці партызан і падпольшчыкаў сустракаюцца з цэлым шэрагам цяжкасцей. Партызаны і падпольшчыкі дзейнічалі патаемна і асцярожна. Многія дакументы былі страчаны. Жывых сведкаў тых даўніх падзей практычна не засталося. Акрамя таго, у цяперашні час ствараюцца фэйкі, адбываецца адкрытая фальсіфікацыя гісторыі.ва ўмовах глабальнага перадзелу сфер уплыву ў свеце. Вывучэнне гісторыі Вялікай Айчыннай вайны неабходна працягваць,бо без павагі да мінулага, без захавання гісторыі няма будучыні, няма дзяржавы і няма народа.